получению знаний по специализации «менеджмент социально-культурной сферы».

Прорабатывая варианты идей, студенты в перспективе смогут сделать эффективный бизнес-анализ. К сожалению, отсутствуют идеи по технологиям эффективных продаж, т. к. искусство продаж – один из основных навыков, который необходимо освоить и уметь воплощать на практике «культурологу-менеджеру».

Список использованной литературы:

1. Тульчинский Г.Л. Менеджмент в сфере культуры. / Г.Л. Тульчинский. - С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. СПб.: Лань, 2001. – 265 с.

2. Котлер, Ф. Латеральный маркетинг: технология поиска революционных идей / Филип Котнер, Фернандо Триас де Бес. – М : Альпина Паблишерз, 2010. – 256 с.

3. Новаторов В.Е. Маркетинг в социально-культурной сфере. / В.Е. Новаторов. - Омск: Омич, 2000. – 167 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аляксейчык В.А., студ. гр. 450 ФІДК БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Бамбешка І.І., ст. выкладчык

## ФАРМІРАВАННЕ ВУЧЭБНЫХ КАЛЕКЦЫЙ ПРЫ ЖАНОЧЫХ ГІМНАЗІЯХ У БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

Да моманту далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі большасць жаночых школ утрымлівалася рознымі духоўнымі ордэнамі, хаця існавалі і свецкія школы, арганізаваныя на ўзор манастырскіх. У другой палове XIX ст. на Беларусі сфарміраваліся два асноўныя тыпы сярэдніх жаночых навучальных

устаноў: гімназіі Марыінскага ведамства і навучальныя ўстановы духоўнага ведамства [4, с. 33].

Канец XIX - пачатак XX ст. – перыяд масавага стварэння жаночых навучальных устаноў, што было выклікана дэмакратызацыяй грамадства і павышэннем цікавасці да жаночай адукацыі [4, с. 41].

Поспехам у працэсе навучання спрыяла шырокае выкарыстанне наглядных дапаможнікаў: фізічных прылад і механічных машын, карт і глобусаў, заалагічных і батанічных узораў. У жаночых гімназіях найбольш актыўна выкарыстоўваліся атласы, геаграфічныя і гістарычныя карты, глобусы, мадэлі для малявання і інш. Так, у Гомельскай прыватнай яўрэйскай жаночай гімназіі Гурэвіч па дадзеных на 1915 г. налічвалася 432 дапаможнікі, у тым ліку па батаніцы – 36, па заалогіі – 47, па мінералогіі – 81, па анатоміі – 45, геаграфічных карт – 77, гістарычных карт – 28, прадметаў для малявання – 30 [4, с. 73].

У некаторых жаночых гімназіях ствараліся розныя па колькасным і якасным складзе фізічныя, прыродазнаўчыя, мінералагічныя кабінеты, прадметы і ўзоры якіх выкарыстоўваліся ў працэсе выкладання. Можна разгледзець некалькі прыкладаў.

У студзені 1863 г. у Буйнічах было заснавана Магілёўскае жаночае вучылішча для дзяўчын духоўнага звання, дзе з увядзеннем у праграму навучання курса фізікі ў пачатку 1880-х гг. пачаў ствараца фізічны кабінет. Ён абавязаны сваім заснаваннем наглядчыку па гаспадарчай частцы купцу І. М. Цярэнцьеву, які ў 1881 г. ахвяраваў 800 рублёў на набыццё фізічных прыбораў і інструментаў [6, с. 22]. Збор кабінета на працягу свайго існавання пастаянна павялічваўся: прадметы паступалі як у выніку мэтанакіраванага набыцця, так і шляхам дарэння. У перыяд 1892-1904 гг. кіраўніцтва вучылішча рабіла шмат намаганняў для паляпшэння і пашырэння складу бібліятэкі і фізічнага кабінета. Так, былі адрамантаваны ўсе старыя фізічныя прыборы і інструменты, а ў 1897-1898 гг. набылі новыя прылады агульным коштам 300

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рублёў. Некалькі пазней кабінет папоўніўся новымі прадметамі, падараванымі Гаспадарчым Упраўленнем пры св. Сінодзе [6, с. 32]. Такім чынам, можна сказаць, што Магілёўскае жаночае вучылішча задавальняла свае патрэбы ў наглядных дапаможніках і фізічных прыладах.

У 1879 г. была заснавана Дзвінская прагімназія, пераўтворная ў 1882 г. у гімназію. Ініцыятарам стварэння пры гімназіі бібліятэкі і кабінетаў фізічных, прыродазнаўчых і іншых вучэбных дапаможнікаў быў гарадскі галава П. Ф. Дубровін. У год заснавання навучальнай установы П. Ф. Дубровін набыў для яе вялікую колькасць разнастайных вучэбных дапаможнікаў на суму 325 рублёў 75 капеек, а затым, па меры неабходнасці, набываў карты, карціны, фізічныя прыборы, апараты і інш. На 1904 г. гімназія валодала якаснай калекцыяй самых неабходных вучэбных дапаможнікаў па розных прадметах. Фізічны кабінет гімназіі налічваў 603 прадметы, калекцыя па прыродазнаўстве – 343. Акрамя гэтага, захоўвалася 925 іншых вучэбных дапаможнікаў. Агульная колькасць адзінак захавання ў кабінетах гімназіі складала 1871. Сярод цікавых прадметаў калекцыі вызначаўся “чароўны ліхтар” (ліхтар эфіра-кіслароднага асвятлення) і даволі багатая калекцыя карцін [3, с. 18].

Аднак не ўсе жаночыя навучальныя ўстановы маглі прадставіць сваім навучэнцам багатыя і якасныя дапаможныя матэрыялы. Напрыклад, па дадзеных на 1908 год, бібліятэка і фізічны кабінет Віленскай жаночай гімназіі знаходзіліся ў нездавальняльным стане. Гімназія валодала невялікай колькасцю фізічных прыбораў, большасць з якіх былі старыя ці непрыдатныя для выкарыстання. Неабходныя дапаможнікі пры вывучэнні літаратуры і важнейшыя фізічныя прыборы настаўнікі прыносілі з іншых навучальных устаноў [2, с. 32].

У пачатку XX ст. пры гімназіях пачалі адкрывацца педагагічныя музеі – культурна-асветніцкія ўстановы, якія служылі вывучэнню і прапагандзе матэрыялаў, што адносяцца да школы і асветы. Адзін з такіх музеяў быў адкрыты пры Мінскай жаночай гімназіі. Прадстаўлены там збор падручнікаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбных дапаможнікаў, састарэлых і новых, айчыннага і замежнага выдання, заклікаль быў дапамагчы настаўнікам зарыентавацца ў вялікай колькасці наяўнай вучэбнай літаратуры [1, с. 73].

На мяжы XIX-XX ст. на хвалі ўздыму цікавасці да адукацыі і навукі быў заснаваны шэраг жаночых гімназій: Полацкая (1903 г.), Брэсцкая (1904 г.), Пінская (1906 г.), Мазырская (1911 г.), Слуцкая (1912 г.) і інш. У гэты перыяд у жаночых сярэдніх навучальных установах актывізаваўся працэс стварэння кабінетаў фізікі і прыродазнаўчых навук, абсталяваных адпаведнымі прыборамі і дапаможнікамі [4, с. 41].

24 верасня 1910 г. была заснавана Слонімская жаночая гімназія. Спачатку гімназія мела толькі бібліятэку, але пазней склаліся багатыя і разнастайныя калекцыі. Фізічны кабінет Слонімскай гімназіі налічваў 316 прыбораў. У прыродазнаўчым кабінеце захоўваліся 222 прадметы, у тым ліку шкілет чалавека, гіпсавыя разборныя мадэлі асобных органаў цела чалавека, якія выкарыстоўваліся на ўроках гігіены. Акрамя гэтага, гімназія мела 105 навучальных дапаможнікаў па геаграфіі, 110 па гісторыі (атласы, глобусы, геаграфічныя і гістарычныя карты), 255 па маляванні (мадэлі з пап'е-машэ, гіпсу, тэракоты, гліны), 888 па рукадзеллі [5, с. 273]. З пачаткам першай сусветнай вайны, калі пачалася эвакуацыя Слонімскай гімназіі ў Калужскую губерню, з-за недахопу часу ўсю маёмасць не змаглі вывезці: мэбля, бібліятэка і кабінеты засталіся ў Слоніме. Далейшы лёс калекцый невядомы [5, с. 274].

Невялікія калекцыі наглядных дапаможнікаў, фізічных прылад, заалагічных, мінералагічных узораў мела амаль кожная жаночая гімназія. Так, фізічны кабінет Аршанскай гімназіі на 1916 г. налічваў 345 прыбораў, а кабінет натуральнай гісторыі − 104 прадметы. Гомельская гімназія мела фізічны кабінет з колькасцю прадметаў 354, і прыродазнаўчую калекцыю – 295 прадметаў. У Пінскай гімназіі фізічны кабінет налічваў 346 прыбораў, прыродазнаўчы – 324 прадметы. У некаторых навучальных установах з-за недахопу месца кабінетам і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калекцыям не адводзілі асобнага памяшкання, а размяшчалі іх у класах і калідорах [4, с. 74].

Можна адзначыць, што большасць кабінетаў гімназій складаліся з наглядных дапаможнікаў па розных прадметах. Гэта было выклікана неабходнасцю рэалізацыі асноўнага дыдактычнага прынцыпу канца XIX – пачатку XX ст. – прынцыпу нагляднасці. Наглядныя матэрыялы дапамагалі навучэнцам зразумець пэўныя з'явы, падзеі, атрымаць больш поўнае ўяўленне аб навакольным свеце. Такім чынам, кабінеты навучальных дапаможнікаў адыгрывалі важную ролю ў справе гімназічнай адукацыі і былі асабліва неабходныя для нагляднага засваення такіх прадметаў, як гісторыя, геаграфія, фізіка і інш.

Дзейнасць музеяў пры жаночых гімназіях і вучылішчах суправаджалі цяжкасці, характэрныя для большасці тагачасных музеяў: з-за недахопу сродкаў камплектаванне калекцый было выпадковым, адсутнічала іх дакладная прафілізацыя, не ствараліся каталогі. Малыя памяшканні альбо ўвогуле адсутнасць выставачнай плошчы не дазвалялі якасна прадставіць калекцыі наведвальнікам. Па гэтай жа прычыне не забяспечвалася захаванасць прадметаў калекцый, што прыводзіла да іх псавання і знішчэння. Аднак, нягледзячы на ўсе адмоўныя бакі ў арганізацыі кабінетаў, неабходна падкрэсліць іх станоўчую ролю ў развіцці жаночай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі Беларусі, паколькі яны мелі важнае значэнне ў працэсе засваення ведаў вучаніцамі гімназій, у фарміраванні іх навуковага светапогляду.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Евдокимова, Е. Л. Гимназическое образование в Беларуси: исторический опыт и тенденции развития (XIX–нач. XX вв.) / Е. Л. Евдокимова. – Мн.: НИО, 1998. – 140 с.

2. Киприанович, Г. Я. К истории женского образования в Западной России / Г. Я. Киприанович. – Вильна: Губ. тип., 1910. – 68 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Михайлов, Д. И. Историческая записка 25-летия Двинской женской гимназии, 1879-1904 г. / Д. И. Михайлов. – Витебск: Губ. типо-литогр., 1905. – 47 с.

4. Ступакевич, М. А. Женское образование в Беларуси (вторая половина XIX века – 1917 год) / М. А. Ступакевич. – Гродно: ГрГУ, 2006. – 169 с.

5. Ступакевич, М. А. Развитие женского гимназического образования в уездных городах Гродненской губернии в начале XX века (на примере Слонимской женской гимназии) / М. А. Ступакевич // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры / Міністэрства адукацыі РБ, Установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы". – Гродна, 2007. – С. 269-274.

6. Шелепин, Н. Могилевское женское училище духовного ведомства (1863-1913 гг.) / Н. Шелепин, Н. Гамолко. – Могилев: Тип. И. Б. Клаза и М. Л. Кагана, 1914. – 171 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Андралович С.С., студ. гр.211 ФК и СКД БГУКИ
Научный руководитель – Смаргович И.Л., доцент

## ОСОБЕННОСТИ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ АРТ - МЕНЕДЖЕРА В ТВОРЧЕСКОЙ (КУЛЬТУРНОЙ) ИНДУСТРИИ

С 1960-х годов 20 века в связи с культурной революцией во всем мире наблюдается процесс сближения искусства и коммерции. С этим и связано возникновение творческих индустрий - «деятельность, в основе которой лежит индивидуальное творческое начало, навык или талант, и которая может создавать добавленную стоимость и рабочие места путем производства и эксплуатации интеллектуальной собственности»[1, с.12].